*Штогадовы сход ЕЎРАПЕЙСКАЙ ФЕДЭРАЦЫІ ЖУРНАЛІСТАЎ*

г. Будва, Чарнагорыя, 1-2 чэрвеня 2015 года

## Заява ЕФЖ у сувязі з трывожнай сітуацыяй у сферы фрыланс-журналістыкі ў Беларусі

Актуальнай праблемай для журналістаў Беларусі з'яўляецца фактычнае непрызнанне наяўнасці фрылансераў – журналістаў, якія не супрацоўнічаюць пастаянна з якім-небудзь канкрэтным СМІ.

Асабліва складанае становішча ў тых фрылансераў, якія супрацоўнічаюць з замежнымі медыя, паколькі яны не згадваюцца ў беларускім заканадаўстве.

Паколькі ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб СМІ» «журналіст замежнага сродку масавай інфармацыі» павінен быць звязаны з рэдакцыяй працоўнымі стасункамі, фрылансеры не маюць магчымасці атрымаць акрэдытацыю, якая выдаецца Міністэрствам замежных спраў. За сваю дзейнасць без акрэдытацыі ў якасці журналістаў яны церпяць пераслед у судовым парадку.

З красавіка 2014 фрылансераў, якія супрацоўнічаюць з замежнымі СМІ, 22 разы судзілі за парушэнне артыкула 22.9 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях Рэспублікі Беларусь і абавязвалі іх да выплаты штрафаў, якія ў суме склалі ўжо больш за 7000 еўра ў эквіваленце.

Падобны пераслед за распаўсюд інфармацыі ў замежных медыя з'яўляецца грубым парушэннем стандартаў свабоды слова і замахам на правы журналістаў.

У сувязі з гэтым Еўрапейская федэрацыя журналістаў:

- выказвае сваю салідарнасць з журналістамі-фрылансерамі Беларусі і падтрымлівае барацьбу ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» за роўнасць правоў усіх журналістаў пры ажыццяўленні імі прафесійнай дзейнасці;

- заклікае ўлады Беларусі неадкладна спыніць ціск на журналістаў-фрылансераў, якія супрацоўнічаюць з замежнымі СМІ, у прыватнасці, адмовіцца ад практыкі прыцягнення іх да адміністрацыйнай адказнасці.

- заклікае інстытуцыі Савета Еўропы, АБСЕ і Еўрапейскага Саюза звярнуць увагу на парушэнні свабоды слова ў Беларусі, звязаныя з дзейнасцю журналістаў-фрылансераў, і зрабіць крокі для выпраўлення сітуацыі.

Прынята аднагалосна дэлегатамі Штогадовага сходу ЕФЖ
02.06.2015 г.